ботали для участников события «Viva Braslav» проект экскурсионного маршрута, который позволит совместить активный отдых и познавательную экскурсию.

В своей основе активный туризм подразумевает не только активную деятельность в месте пребывания, но и активные способы передвижения. В данном случае мы предлагаем использовать вариант передвижения на роликовых лыжах, которые позволяют перемещаться по местности быстрее обычного пешехода и за короткий срок увидеть множество достопримечательностей. Экскурсия гармонично вписывается в программу спортивно-музыкального фестиваля, целевая аудитория которого – это молодежь, преимущественно, до 30 лет. Для не умеющих кататься на роликовых лыжах экскурсия – хороший стимул получить базовые навыки, в целом, программа рассчитана на туристов, у которых опыт катания не менее 2-ух лет.

Проектом данной обзорно-тематической экскурсии является шестичасовой маршрут «г. Браслав – д. Слободка – д. Иказнь», общей протяжённостью 35 км. В маршрут вошли наиболее значимые экскурсионные объекты: католическая церковь Божьего Провидения, городище Иказненского замка, церковь Божьего Тела, православная церковь Святого Николая, церковь Рождества Пресвятой Девы Марии, городище «Замковая гора», церковь Успения Богородицы. При составлении маршрута следования учитывались не только информативность, познавательная ценность экскурсионных объектов, но и расположение, наличие удобных подъездных путей при использовании роликовых лыж и площадок показа.

Был составлен контрольный текст экскурсии – одна из составляющих экскурсионной документации. Он включил в себя всевозможные сведения об экскурсионных объектах, начиная с возникновения, истории развития до их гибели, если таковая была, и о последующем восстановлении. Разработанный текст можно использовать как пособие для подготовки к экскурсии.

Для помощи в организации экскурсии была создана методическая разработка, излагающая требования экскурсионной методики с учетом особенностей демонстрируемых объектов и содержания излагаемого материала. Полная информация о маршруте представлена в технологической карте. Программа экскурсии и информационный листок содержат в себе краткие сведения о главных объектах экскурсии, перечне услуг, временных рамках, условиях обслуживания и стоимости.

При калькуляции себестоимости туристского продукта были учтены прямые и косвенные статьи расходов. Полная стоимость тура на группу 16 человек (16+3 бесплатно) составила 405 BYR, стоимость одной путевки 25 рублей 50 копеек BYR.

**Заключение**. Таким образом, разработанный проект является готовым продуктом с необходимым пакетом документов. Он может быть использован по прямому назначению как туристско-экскурсионный маршрут, в ходе которого участники и гости фестиваля«Viva Braslav» ознакомятся с природными и архитектурными достопримечательностями Браславщины. В то же время, предлагаемое экскурсионное предложение соединяет в себе традиционные формы отдыха с экспериментом в рамках культурно-спортивного мероприятия, на который туристы не решаются пойти в обычных условиях. Все это заметно поднимает оценку продукта туристами и делает его более привлекательным.

1. Фестиваль Viva Braslav 2017 [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://vivabraslav.by/en/artists/year-2017/. – Дата доступа: 25.04.2017.

## ПРАБЛЕМА ПАХОДЖАННЯ КАТАЛІЦКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ

***Чэўжык І.С.***

*навучэнка 2 курса Полацкага каледжа ВДУ імя П.М. Машэрава,*

*г. Полацк, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік – Атвалка А.У., выкладчык*

У гэтым годзе споўнілася 632 гады з моманту афіцыйнага ўвядзення каталіцкай веры ў Вялікім Княстве Літоўскім. Безумоўна, гэтая падзея мела вялікае значэнне для далейшай гісторыі беларускага народу.

Адносіны гісторыкаў да гэтай падзеі былі рознымі, у залежнасці ад краіны, да якой яны належылі. Калі польскія і літоўскія даследчыкі ў цэлым станоўча адносіліся к змене палітычнай арыентацыі правячай эліты ВКЛ, то расійскія, а потым савецкія гісторыкі паставіліся вельмі



Репозиторий ВГУ

адмоўна.Таму праблема этнагенэза каталіцкага насельніцтва Беларусі ў нашай краіне недастаткова даследавана.

Актульнасць даследавання вызначаецца вялікім значэннем, якую адыгрывае каталіцкая царква ў сучасных умовах развіцця Рэспублікі Беларусь.

Мэта даследавання – вывучыцць этнічнае паходжанне сучаснага каталіцкага насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне было праведзена з выкарыстаннем матэрыялаў вядучых беларускіх і літоўскіх археолагаў, з выкарыстаннем метадаў параўнання і аналізу. Згодна з дадзенымі матэрыяламі была складзена карта археалагічных помнікаў балтаў VIII – XIII стагоддзяў на беларускіх і літоўскіх землях. Затым, выкарыстоўваючы Энцыклапедыю гісторыі, былі складзены карты заснавання касцёлаў у гарадах і вёсках Беларусі у канцы XIV – др.пал. XVI стагоддзя з указаннем даты узвядзення. Карты сеткі касцёлаў складзены ўпершыню ў гістарычнай навуцы. Пры супастаўленні карты археалагічных помнікаў і карт касцёлаў аказалася, што храмы былі заснаваны якраз у месцах пражывання балтаў-язычнікаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Паводле звесткаў археалогіі і гідраніміі, амаль усю сучасную тэрыторыю Беларусі яшчэ ў пачатку нашай эры займалі балцкія плямёны.Паступовае прасоўваньне славянаў на поўнач і асіміляцыя імі балтаў пачаліся з сярэдзіны 1 тыс. н.э. Згодна з большасцю археолагаў, у сяр. 1 тыс. н.э., балты падзяляліся на заходніх (прусы, яцвягі, куршы), усходніх (літва, аўкштайты, жэмайты, латгалы, земгалы), дняпроўскіх [5, т.1, с.284]. Вычляненне дняпроўскіх балтаў можна правесці толькі археалагічна. Да іх належыла ў цэнтральнай і ўсходняй Беларусі культура тыпу верхняга пласту Банцараўшчыны (банцараўская, банцараўска-тушамлянская) трэцяй чвэрці 1 тыс. н.э. [4, с.71].

На нашу думку, прыток славянаў-перасяленцаў колькасна быў не такі ўжо вялікі, таму славянізацыя балтаў адбывалася найперш дзякуючы славянскім гарадам, княскай дружыне, а з канца 10 ст. – хрысціянскай праваслаўнай царкве. Аднак неасіміляванае балцкае насельніцтва па-ранейшаму заставалася язычніцкім [1, с.31].

Пасля заключэння Крэўскай уніі першыя касцёлы былі заснаваны ў Вільні, Немянчыне, Мейшаголе, Медніках, Вількаміре (Літва), Крэве, Лідзе, Ашмянах, Быстрыцы, Гайне, Абольцах (Беларусь). Усе яны, ў большасці, безумоўна, размяшчаліся ў месцах пражывання балцкамоўнага насельніцтва. Адносна Абольцаў (сёння Талачынскі раён Віцебскай вобласці) даследаванне антрапаніміі і мясцовых жыхароў праводзілася паводле кнігі запісаў Метрыкі ВКЛ. Антрапонімы маюць яскрава балцкае паходжанне. У сярэдзіне XV ст. у воласці Абольцы жылі сяляне з антрапонімамі Трічіс, Свіркліс, Добутіс, Рімейшіс і іншыя [1,с. 44].

Пакуль што даследчыкі не ўдзялялі дастаткова ўвагі Гайне і яе ваколіцам (Лагойскі раён Мінскай вобласці). Між тым трэба звярнуць увагу на тое, што яшчэ ў 1553 г., г.зн. задоўга да масавага акаталічвання шляхты, касцёлы існавалі і адносна недалёка ад Гайны – у Астрошыцах, Радашковічах і Вязыні. У спісе сялянаў звяртаюць увагу антрапонімы Шылук Барташэвіч, Станіслаў Кгінюшавіч, Паўлюк Вайшковіч, Балтруш Кадут, Мацей Белаш, а таксама шэраг іншых з тыпова каталіцкімі імёнамі.

Ад Гайны і яе ваколіцаў арэал пражывання балтаў у сярэднявеччы цягнуўся ў кірунку Радашковічаў і Івянца, пра што сведчыць і шматлікая балцкая айканімія. Да канца XIV ст. касцёлы з'яўляюцца ў Гродне (фара Вітаўта), Мінску, Лідзе, Ашмянах, Пінску. З 30-х гадоў 15 стагоддзя пачынаецца масавае будаўніцтва касцёлаў на Беларусі і Літве. Усяго за гэты час у Віленскай епархіі было заснавана іх 99 [3, с.61]. Амаль ўсе яны былі заснаваныя, як пераканаўча паказала наша даследаванне, у мессцах пражывання балтаў-язычнікаў.

Усяго к 1500 г. у Віленскай епархіі існавала 126 касцёлаў і 10 кляштароў. З гэтай колькасці на тэрыторыі сучаснай Беларусі 85. Перыяд з 1500 па 1569 г.г. з'яўляецца завяршальным этапам хрысціянізацыі язычнікаў на тэрыторыі Беларусі і Літвы. У гэты час у Віленскай епархіі было заснавана 129 новых храмаў. Усяго на Беларусі было пабудавана 65 новых храмаў. Агульная колькасць іх дасягнула 255. З іх 150 – на тэрыторыі Беларусі [5, т.1-6].

З моманту ўтварэння Рэчы Паспалітай (1569 г.), а асабліва пасля Берасцейскай царкоўнай уніі (1596 г.), калі на Беларусі з'явіліся езуіты, каталіцтва пачынае распаўсюджвацца на праваслаўныя славянскія тэрыторыі. З'яўленне касцёлаў і кляштароў у XVII–XVIII стагоддзях на тэрыторыі цэнтральнай і ўсходняй Беларусі звязваць з балцкім этнасам няма ніякіх падстаў. Католікі гэтых вякоў і гэтых тэрыторый – прадукт місіянерскай дзейнасці езуітаў і другіх каталіцкіх ордэнаў сярод праваслаўнага насельніцтва.



Репозиторий ВГУ

Працэс славянізацыі, а пазней беларусізцыі балцкага насельніцтва пасля прыняцця каталіцтва, не прыпыніўся. Першымі паддаліся асіміляцыі і перайшлі на беларускую мову балты, пражывavaўшыя ў ізаліраваных паселішчах у цэнтральнай і усходняй Беларусі (патомкі дняпроўскіх балтаў) [2, с.118].

Як нам здаецца, к пачатку XVII ст. балта-славянская этнічная мяжа праходзіла прыкладна па лініі: Радунь – Іўе – Ліда – Крэва – Смаргонь – Паставы – Браслаў. Потым працэс балта-славянскага ўзаемадзеяння прыпыніўся амаль на 200 гадоў і лінія гэта захоўвалася аж да пачатку XIX стагоддзя. Тлумачылася гэта значным вынішчэннем як беларускага так і літоўскага насельніцтва ў войнах сяр. XVII і пач.XVIII ст.ст. З сярэдзіны XIX ст. на беларускую мову пачало пераходзіць насельніцтва тэрыторыі былых аўкштайтаў. У выніку каталікі амаль ўсёй Беларусі і Віленскага краю да пачатку XX ст. перайшлі на беларускую мову. Аднак у некаторых раёнах да сёняшняга часу засталіся вёскі з літоўскім насельніцтвам [3, с.143].

**Заключэнне.** Такім чынам галоўнай высновай нашай работы з’яўляецца доказ таго, што сённяшнія беларускія каталікі ёсць патомкі найбольш старажытных жыхароў нашай краіны – балцкіх плямён. Застаўшыся на сваёй адвечнай тэрыторыі, пасля прыходу славян, яны доўгі час захоўвалі сваю мову і язычніцкую рэлігію. Многія паддаліся славянізацыі і хрысціянізацыі, але да канца XIV ст. захаваліся яшчэ вялікія групы балцкагаязычніцкага насельніцтва – галоўным чынам на паўночным захадзе Беларусі і ў ізаляваных “астраўках” сярод праваслаўных. У XV–XVI ст.пасля Крэўскай уніii яны прымаюць каталіцкую рэлігію, але паступова страчваюць родную мову, пераходзяць на беларускую.

Гісторыя з’яўлення каталіцызму з’яўляецца вельмі важнай часткай гісторыі Беларусі. Сучасная карта рэлігій у Рэспубліцы Беларусь паказвае складаны працэс балта-славянскага ўзаемадзеяння на працягу многіх стагоддзяў. Ёсць упэўненасць, што міжнацыянальная і міжканфесійная згода назаўсёды будуць панаваць у нашым грамдзстве і садзейнічаць далейшаму паступальнаму развіццю нашай краіны ў XXI стагоддзі.


1. Гаучас П. К вопросу о восточных и южных границах литовской этнической территории в средневековье / П. Гаучас. – Москва: Наука, 1988. – 328 с.
2. Зверуго Я.Г. Славяно-балтские связи в раннем средневековье (по материалам Белоруссии) /Я.Г.Зверуго. – Вильнюс, 1985. – 255 с.
3. Зинкявичус З. Восточная Литва в прошлом и настоящем /З.Зинкявичус. – Вильнюс, 1996. – 355 с.
4. Седов В.В. Днепровскиебалты. Проблема этногенеза и этнической истории балтов / В.В.Седов. – Вильнюс, 1985. – 218 с.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. /пад. рэд. М.Ткачова.– Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1993 – 2003.


## ПОРТСМУТСКИЙ МИРНЫЙ ДОГОВОР


***Шишкин Д.А.***

*студент 4 курса ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*

*Научный руководитель – Моторова Н.С., канд. ист. наук, доцент*


В конце XIX в. обострились отношения между Россией и Японией за первенство в Дальневосточном регионе. Интересы двух стран пересеклись на территории Кореи, которая обладала богатыми природными и рабочими ресурсами. Обе страны желали включить ее в свою сферу влияния. Конфликт постепенно разрастался и привел к войне 1904–1905 гг. Боевые действия велись как на суше, так и на море. Во время войны активно использовался военный флот, впервые начали активно применять миноносцы. Кроме того Русско-японская война показала всю эффективность артиллерии, что повлияло на дальнейшее развитие военной стратегии. Все вышеизложенное обуславливает актуальность выбранной темы.

Цель данного исследования заключается в оценке итогов Русско-японской войны.

**Материал и методы.** Исследование подготовлено на основании анализа воспоминаний С.Ю. Витте, возглавлявшего российскую делегацию на переговорах в Портсмуте, а также документов, опубликованных в «Красном архиве». При его проведении использовались общенаучные методы исследования (сравнение, анализ, синтез) и специально-исторические (историко-генетический и историко-сравнительный).

**Результаты и их обсуждение.** Начиная войну с Россией, Япония рассчитывала на быструю победу, вести затяжную войну она не могла. Поэтому свои первые требования японцы подготовили летом 1904 г. на волне первых военных успехов. Япония планировала потребовать у России уплату контрибуции, признать Корею зоной влияния Японии, вывести свои войска из



Репозиторий ВГУ